БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухсуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб.
на апошняй 50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 30. Менск. Субота 27 красавіка 1918 г. Год I

Менск 27 IV.

Пасьля паводкі.

Пусьцее Менск... С кожным днем усе радзей і радзей бачыш на вуліцы расійскую салдацкую шынэлю. Ні так б'е у вушы і варшауская вымова крулевякау, што саусім нідауна была заліла нашае места. Чатыры гады ужо, як апанавала Менск гэтая хваля рожных народау і схавала ад сьвету дзеннаго спраконвечных жыхароу беларускаго Менску. З Масквы вайсковыя, з Варшавы уцекачы. Адных і другіх аб'еднау у сабе Земсаюз і безканечныя таварыствы помачы, сабе помачы і г. і. У фанэрных бараках злучыліся людзі дзьвух варожых культурау маскоускай і польскай. Адзеушы фрэнч, чырвоны крыж і монограмму, альбо «ожэлэк» яны дужа добра устроіваліся на пажыву каля сусьветнаго торжышча, што адбывалося на беларускай зямлі.

Трэба прауду казаць, зарабілі і менчукі на гэтых саюзах і саюзніках і зарабілі ні кепска. Горад вырас адразу бэзмала у трае. Паадчынялося, ні глядзя на ваенны час, гэстолькі крамау, прэдпрыемствау, колькі было перад вайною. Але .. Але дзякуй Богу, што гэто мінуло. З вялікай прыемнасьцю углядаюцца менчукі на поуныя да верху цягнікі, што вывозяць ад нас чужынцоу,— туды адкуль яны прыехалі. І патроху, аглядаючыся, вылазіць с пад фанэрных абломкау, с пад зашчытных кальорау старое праудзіва беларускае абліччо Менску.— Гэтак пасьля паводкі, як вада вернецца у старые берагі с пад пазастаушаго на залітай уперад сенажаці бруду вылазіць патроху сьвежая зяленінькая травіца. На памяць аб паводцэ многа ішчэ застаецца усякаго ламачча, гнілога сітніку і балотнай травы. Але прыдзе гаспадар з жалезнымі грабэлькамі, чысьценька зграбе усе у кучу, высушыць, а пасьля спаліць—і попел разсеіць па сенажаці.

Шмат і у нас застаецца пакуль што памятак гэтай паводкі. Руссіфікатары з земсаюзу захапілі у свае рукі самаўправы і асабліва заняты «прасьветай» беларускаго народу. Сваіх пазыцыяу у школі яны ні за што ні хочуць здаваць. Дый ці можа быць іначэй? Яны цяпер амаль што ні «собиратели земли русской». Хто-ж апрача іх зможа аднавіць тыя ланцугі, якімі прыкула Масква да сябе «Западный край?» Хто будзе бараніць слауныя традыцыі Мяруаева, Шміта і Замыслоускаго, сьцерагчы рубяжы «всея Россіи»? —Яны, загадчыкі лазьняу і пральняу, уселякіе «завѣдующіе» і звычайныя земгусары. Тые, што у пачатку вайны у залатых пагонах насілі часам патрэты і крычалі «ура», у рэвалюцыю паначэплялі «настоящій рубашечный» кумач і цягалі на салдацкія мітынгі «зямлю і волю», а цяперака выдаюць з сябе вельмі лойальных, дзелавых і «патрэбных для краю» людзей. Хутчэй, хутчэй ніхай перарастае гэты мул маладая, зяленая беларуская траука.

У нядзялю каля касьцелу так сама як і дауней натоуп народу; шмат у каго «ожэлкі». Але натоуп саусім другі. Дзе падзеліся крыклівые, падзьмутые мазуры; Усюдых лупае беларуская мова і з усіх бакоу глядзяць на цябе знаемые тутэйшые твары. І гэтая рэчка сходзіць у свае берагі. Толькі па ей даунейшая памяць будзе. Калі с пад мулу праб'ецца першая зяленая травіца, дык разам з ею павылазяць і нігодные травы, палыны ды крапівы. І доуга яны ішчэ расьці будуць і глушыць беларускі мурог. Але ні выжывуць пад простымі праменнямі сонейка.

Усе гэтыя чатэры годы палякі будавалі у насе свае школы. Трэба за імі гэта прызнаць, што школы у іх—як раз такіе, як ім трэба. Беларускае дзіцяне з гэтай школы ці ахронкі прытулку ні выйдзе беларускім; мала надзеі каб яно і пасьля вярнулося да свайго народу—яго ужо ахвяразалі Варшаві. А трэба сказаць што ва усіх польскіх школах і да гэтаго часу пераважалі беларусы—каталікі; цяперака, як бежанцы з'едуць дамоу, астануцца адны дзеці нашых тутэйшых каталікоу і яны усе будуць выгадаваны на палякоу. Расійскіе школы шмат шкоды прынесьлі беларускаму народу; але яны гэтак дрэнна пастаулены, што па іх у душы дзіцяці аставауся малы сьлед. А польская школа, арганізаваная крулевякамі, будзе падтрымана тутэйшым спольшчаным грамадзянствам. Памятаючы ягелонскіе запаветы, яно верна будзе служыць мачысе дый проці роднае маткі. У гэтай справі аб'еднаюцца усе палякі—іправые і левые, нават прыяцелі беларушчыны. І доуга ішчэ будзе гадавацца вялікая часьціна дзяцей беларускіх у романтычнай Польшчы да чужаніцы далекай мачыхі і у пагардзі да свайго роднаго беларускаго. І доуга ішчэ будзе часьціна маладзежы нашай насіць на грудзях лупежніка— арла замест радзімай пагоні.

Беларусам трэба будаваць школы і школы. Ні сіла духоунай культуры нашых суседзяу, ні іх зпадворная магутнасьць ні падаюць вялікаго духа адраджэння. Дух гэты ужо уходзіць у беларускія школы і ен нам створыць новы народ, які паверне сабе славу даунейшых часоу сваей гісторыі. Тады ні страшны будуць нам чужынцы. Аб часох іхняго панавання над Беларусьяй будуць расказваць як аб даунай цемнай мінуушчыні. Вось як цяпер аб часах паншчыны.

* * *

Валасная і мястэчковая палітыка.

У Віленшчыне прышлося быць нам пры урадзе Керэнскаго на пэршых сабраннях усесаслоўнаго земства. Выбары 12 сэнатароў былі першыя на чтырохвостны. Прайшлі яны пры рэвалюцыйным настрою «далоў і давай». Векавыя абіды і прыціск былі натуральнымі гэтаму прычынамі. Ні выбралі нават галодных сельскіх настаўнікоў, як буржуёў і контр-рэвалюцыянэроў. На першых і астатніх трох сходах прабавалі рабіць парадак, але хвалі «саветаў» змылі іх.

Напалі мы гэтымі днямі на валасное земства, у тую самую валасьць. Працiралі толькі вочы з дзіву. Скора ніха перавыбралі нанова усіх. Выбралі на прынцыпу коаліцыі с інтэлігэнцыяй. З дзесяток памешчыкоў, сельскія вучыцелі, сыны вёскі—бытўшыя чыноўнікі, загнаныя першы раз за дзесяць лет палітычным і ваенным пераваротам пад родную страху, некалькі старых дзядзькэў, мудрых практыкай рэвалюцыі і жыцця і адзін стары жыд—земляроб.

Склад проста высока інтэлігэнтны, хоць давай ім пад загад павет, а ні звычайную валасьць.

Разгаворы каротнія, да справы. Выбіралі на прэдседацеля і 2 членаў валасной управы, людзей па дзелавой годнасьці. Выбралі ідэальны склад управы, пасьля усетакі доўгіх нарад селянскай фракцыі, маючэй большасьць галасоў.

Завялі міліцыю валасную, пачтовую стойку, пастанавілі знайсьці судзьзю і т. д. За 2—3 тыдні мэханізм валасьці будзе ўжо функцыянаваць.

Мястэчко, як сталіца валасьці, начало такую самую творчую і арганізуючую працу. Сталіца і вёскі вайшлі у кантакт, назначылі субсыдзію доктару, завялі супольнаго начальніка міліцыі. Трэба дадаць, што сталічнае і валаснoе самаўрауленні дагаварываюцца у поўгадзіны між сабой. Гэту дзержаўную працу робіць правінцыя сваім гаспадарскім розумам. Німа ніякога кірующаго цэнтру. Трэба скарэй зрабіць такі кіруючы цэнтр з Рады Беларускай Рэспублікі.

А. У.

На беларускім шляху.

У Кіеві.

Як мы пісалі ужо, кіеўскія беларусы выдаюць газэту у расійскай мові— «Бѣлорусское Слово». Цяпер мы атрымалі 3 нум. гэтай газэты (ад 1, 8 і 15 красавіка) і з іх падамо тутака некалькі вестак аб Кіеускім беларускім жыцці.

У Кіеў прыежджала дэлегацыя ад Мазырскаго павету, які на моцы п. 2 мірнай умовы далучаны да Украіны і цяпер ўходзіць у Валынскую губ. Дэлегацыя адведала старшыню Рады народных Міністраў укр. рэсп., катораму падала заяву, што ў Мазырскім павеце жывуць толькі беларусы. П. Галубовіч з гэтым згадзіўся і сказау, што павет мае быць далучаны на аснове самаазначэння жыхароў.

Нёкатары час у Кіеві гасьціўся камісар адэскай беларускай ваеннай арганізацыі п. Баліцкі, мэтай якога былі перагаворы с Кіевам аб устаноўленні ядынай беларускай арганізацыі на тэрыторыі Украіны. 7 красавіка п. Баліцкі у аўдыторыі унівэрсытэту рабіў паведамленне аб адэскіх арганізацыях. Канчаючы паведамленне п. Баліцкі сказаў: Брацця беларусы! «Прыношу вам прывітанне ад беларусаў, што жывуць у Адэсі і яе ваколіцах. Карыстаючы с прысутнасьці тутака прэдстаўнікоў беларускаго ураду вітаю ў іх асобах увесь народ беларускі, аб каторым мы верныя сыны. Беларусі жадна ловім кожнае слово, якоя прыпадкам заляціць да нас... Радасна спаткалі мы вестку аб Беларускім урадзе, пасьля смутнай весьці аб разгоне Усебеларускаго з'езду... Хто-б убачыў гэтыя радасныя твары, пачуў крыкі якія былі пры паведамленні друг друга аб гэтым, той бы зразумеў што жыве Беларусь і ніколі ні загіне. Мы беларусы вялікія патрыоты і любім сваю родную, змучаную і аблітую крывёй Беларусь... Усімі сіламі мы павінны падтрымоўваць наш часовы урад, каторы, будзям спадзявацца за нашай помаччу ні дапусьціць падзелу Беларусі. Ніхай жыве Вольная Беларусь! Ніхай жыве беларускі Устаноўчы Сойм!».

Новазаложаная вялікая арганізацыя у Кіеві аткрыла адзел для помачы уцекачам і рэгістрацыйнае бюро для усіх беларусаў, які жывуць у Кіеве. 29 сакавіка член арганізацыі Н. І. Разумоускі чытаў лекцыю «аб сучасным і будучым становішчу Беларусі».

У памешкані беларускай вайсковай арганізацыі атчыніліся курсы беларусазнаўства. Лекцыі чытаюць па руску пр. пр. М. В. Доўнар-Запольскі і В. З. Завіткевіч.

У хуткім часе пачне выходзіць штомесячная часопісь «Бѣлорусская Мысль» выдаўніцтва беларуск. коопэратываў на Украіне. Гатуецца да выдання пераклад на беларускую мову кнігі А. В. Пѣшехонова. «Аб нацыяналізацыі зямлі.»

Патрэбнасьць арганізацыі у Беларусаў на Украіне расьцець. Ад усюль ідуць прозьбы, паведаміць аб арганізацыі, выслаць газэт.

ДОЧ МЕСЯЦА.

Па сьцежцы праменняў у зьяпнях агнёвых
Спусьцілася месяца доч на зямлю
Дубочак знайшла. Да галінак дубовых
Тулілась, казала: «Браточак, люблю!..»
І доўга лісточкі яго цалавала,
І доўга галінкі яго абыймала,
І грэла ад холаду ночнай зямлі
Густою касой і грудзьмі...

* * *

У рэчку ўгледаўся жар месяц чырвоны,
У пушчы шукаў ён лятуху—дачку:
Мо'дзесьці завабіў лужочак зялёны,
Мо' нейдзе зьбірае грыбкоў у ляску.
І дзетак міленькіх—ружованькіх зорак
Паслаў ён на ціхі ля рэчкі узгорак.
Гукалі-шукалі, нідзе ні знайшлі
Вярнуліся с чым і пайшлі...

* * *

Да раніцы месяца доч забаўлялась,
Зьвінелі і песьні і казкі яе.
«Царыца-зарніца ужо паказалась...
Хутчэй палячу, бо татуля прыбье!..»
Дубочак маўчыць і дамоў ні пускае.
Галіны у коскі яе уплетае.
Доч Месяца плача: «Пусьці дарагі!
Жар-Месяц глядзіць на лугі...»

* * *

«Вун бачыш ад злосьці як ён чырванее,
Пусьці мой міленькі, да хаты пара.
Жар-месяц трывожыцца, гнеўны бляднее.
Ярчэй і ярчэй запылала зара...
Вун носюцца качкі над ціхім чаротам,
Вун птушкі пяюць над туманным балотам.
Пусьці-жа дубочак, ляцець у гару,
Бо тут у цябе я памру...»

* * *

Дубок ні пускае, мацней прыгартае
Да росных грудзей да вільготнаго пня.
Доч месяца вочкі свае закрывае,
Доч месяца ціха сканала да дня..
Блішчаць на дубовых лістках ні расінкі,
А буйныя, сьветлыя кроплі—сьлязінкі.
То плача ад жалю ад гора—бяды
Зялёны дубок малады...

Ясакар.

Агульныя весткі.

РОТТЭРДАМ. 23 гм. Паведамляюць с Парыжу, што мейсцовыя бітвы робяцца часьцейшымі больш заўзятымі. Немцы робяць вялікія перастановы войск, узмацняюць і сплачаюць іх. Каб утрымаць ніпэўнасьць у непрыяцеля ад Ньюпорта аж да Вэрдэна ідзець стрэляніна.

ЦЮРЫХ. 24 гм. Парыжскія газэты пішуць, што Фош намераецца сабраўшы усе якія іншэ можна ужыць аддзелы войска і зрабіць імі націск на нямецкія пазыцыі каля Аррасу каб іх прарваць.

БАЗЭЛЬ. 24 гм. «Matin» паведамляе аб абстрэлах нямецкай цяжкай артылерыяй фортэцыяў Туль і Эпіналь.

БАЗЭЛЬ. 24 гм. Па тутэйшым вёсткам французы за апошнія 8 дзен прыгатавалі далдйшыя кавалкі фронту на працягу роўна 100 кіламэтраў. «Пті журн.» паведамляе аб прыбыцці на французскую тэрыторыю першых італьянскіх войск. Часьць іх мае прайсьці праз Парыж.

БЭРЛІН. 24 гм. «Вольф». Імпэрскі канцлер гр. ф. Гэртлінг вярнуўся у Бэрлін.

БАЗЭЛЬ. 22 гм. Ангельскія газэты пішуць, што ангельскі урад распарадзіўся аб наборы новых 320 тыс. рэкрутаў с пасярод прамысловых работнікаў. Гэта, здаецца, выкліча зноў апазыцыю работніцкай партыі у ніжняй палаці.

БАЗЭЛЬ. 24 гм. «Daily Chronicle» паведамляе, што на сходах у Дубліне у нядзелю было больш 1000 ірляндцаў. Проба дэмонстрацыі ні удалася. Усімі ваенными распараджэннямі для абароны парадку кіруо генэр. Фрэнч

АНГЕЛЬСКІ бюджэт на 1918 г., ўнесены у ніжшую палату Боннар-Лоу, аблічае агульную лічбу выдаткаў у суме 2,972,194.000 фунт., агульная сума даходаў аблічаецця ў 842,050.000 фунт. Новыя падаткі могуць даць 67,850,000 фунт. Уся сума ваенных падаткаў да канца гэтаго году будзе у 1686 мільён. Крэдыты на г. год аблічаюцца ў 225 мільён. фунт. стэрл., гэта становіць 6,180,000 фунт. штодзеннаго выдатку.

БЭРН. 23 гм. «Вольф". У Лёндан ад усюль з Англіі і Шолтяндзіі прыходзяць вёсткі што работнікі ірляндцы з ваенных заводаў уцекаюць массамі у Ірляндзію, дзе спадзяюцца быць болей забэзпечанымі ад прымянення да іх новаго закону аб вайсковай службе.

НЬЮ-ЮРК. 23 гт. «Reuter» паведамляе, што Гватэмала, каторая год таму назад правала стасункі з Нямеччынай, цяпер заявіла што яе стасункі да ваюючых Эўропэйскіх дзержаваў аднаковыя с стасункамі да іх Злучаных Штатаў, што яўляецца абўленнем вайны цэнтральным дзержавам.

ВАШЫНГТОН 22 гм. «Вольф». Паведамленню «Reutera» палата прэдстаўнікаў прыняла дадатковую пастанову да ваенна-марскога закону. Подлуг дадатку марскі корпус павялі чываецца з 30000 да 75000 чалав. Палата пачала разгляд марскога бюджэту, які даходзіць 1½ мільярд. доляроў.

БУКАРЭСТ. 23 гм. «Вольф». Старшыня міністраў молдаўскай рэспублікі і старшыня краёвай Рады пакінулі свае становішча і ўвайшлі як міністры без партфеляў у склад румынскаго кабінэту. Урад у Кішынёві рачнушчаны. Паўсюдах у Бэсарабіі напазкачаны румынскім урадам нрэфэкты. Новым старшынёю краёвай Рады выбраны проф. Стэрэ.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

С серады 24 г. м. зноу пачалі выдаваць хлеб с харчовай крамы Л.-Р. ж. д. Цана за трохфунтовую булку—1 р. 80 к.

Спіскі адпрауленых у Гэрманію менскіх жыхароу на работу паданы нямецкім уладам меськім самаупрауленнем. Нямецкія улады пасьля разгляду спіскау маюць у хуткім часе вярнуць з района Гродны каля 1,500 чалавек. На далей будуць служыць абаронай таму кабні бралі на работу у нямеччыну, нават і бонавыя карткі.

Почта мае пачаць функцыяніраваць у першыя дні мая. Як перадаюць нямецкія газэты пачтова-тэлегр. зьвязь будзе паміж Менскам с цэнтральнымі дзержавамі і акупаванымі краямі. З гэтай прычыны пачт.-тэл чыноунікі апошнімі днямі вельмі мала уезжаюць у Расію.

Хлебны паек, як перадаюць з Менскай Управы, праз колькі часу мае быць павялічаны нямецкай уладай да 1 фунта у дзень на чалавека. Гэта будзе пасьля таго, як уцекачы выедуць з Менску.

Дырэкцыя народных школ закончыла сваю ліквідацыю, апрача тых справау, якія зьвязаны з быушым упрауленнем віленскай учэбнай акругі, якая эвакуіравана у Магілеу. Вышэйшыя і ніжшыя пачатковыя школы у Менску перайшлі пад кірауніцтво меськаго самаупраулення.

З 200 камароускіх арэндатарау земляуласьніка Ваньковіча пасьля патрэбавання ад іх не доімкау за час вайны, унесьлі плату усяго 22 чэл. Ніплаціушым грошы апавешчана аб выселенні.

Гэтакім спосабам выселяюць і арэндатарау—нідаімшчыкау пасада «Новабарысау» б. земляуласьніка Коладзеева. У катэдральных зямель так сама запатрэбавалі арэндную плату за увесь час вайны: за 1918 г.

Менскі кабецкі манастыр астаецца у руках праваслаунаго духавенства. На гэта Епіскап Георгі атрымау запэуненасьці ад нямецкай улады.

Курсы беларусознауства.

29 красавіка лекцыя П. Грыба: „Нашыя песьняры: Янка Купала". Пачатак а 7 гадз.

27 красавіка лекцыя п. Лянкоускаго: «Гісторыя Беларускаго права». Пачатак а 7 гадз.

28 красавіка лекцыя праф. Массоніуса: «Гісторыя беларускаго языка». Пачатак а 6½ г.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоуна[га] камандавання за 26 красавіка 1918 року.

ЗАХАД: Наступ арміі генэрала Сіксга фон Арні[ма] на Кеммель прывеу да поунаго усьпеху. Кемель узвышш[а] значна йдучае у гару над Фландрскаю рауніною, знаходзіц[ца] у нашых руках. Пасьля моцнаго артылерыйскаго агню п[е]хота, якая знаходзіцца пад вадзіцельствам генэралау Зіге і Эбергардта, кінулася учора паранку на штурм. Француз[с]кія дывізыі і атрады ангельцау каля Вісхэтэ і Дранэтэр бы[]лі адкінуты з іх пазыцыяу. Велькія ямы у Сэнт-Элуа і с[а]мае мястэчко забраны намі. Надта шмат бэтонных будоулі[], смацованыя сядзібы, што былі на целі бітвы, захоплены н[а]мі. Пруское й баварскае войско забрало штурмам веску [] узвышшо Кемель. Пад защытаю артылерыі, праходзіуша[] ні гледзючы на трудна—прахадзімую мейсцовасьць, па[] пехата працягнулася на шмат мейсцау да ручая Кеммел[ь]. Мы занялі Дранэтэр і узвышшо пауночна—захадней Вле[] гэльгэка. Атрады лятуноу з вялікім успехам атакавалі д[а]рогу, занятую адступаючымі калонамі і вазамі ніпрыяцел[я]. Як дабытак учарайшаго дня 6500 палонных у большасьц[і] французау: сярод палонных 1 ангельскі і 1 французкі ка[]мандзеры, палкоу. Паудневей Соммы мы ні маглі утрымаць [] сабою Віллерзбрэтоннэ. Далейшыя дужыя контратакі ніпр[ы]яцеля усходней вескі і лесу Ангар, кончыліся для яго ніуд[а]чаю. Лічба палонных у гэтай бітве падвышылася да 240[] Міжы Аурай і Уазай, апрача часамі ажыуляючагося агн[ю] нічога значнаго. На заходным беразі Мозэлю саксонскія а[т]рады занялі французкія акопы і уварваліся у Рэньвілл[]. Пасьля выпаунення свайго задання яны вярнуліся с пало[н]нымі на свае пазыцыі З іншых тэатрау вайны ніякай н[а]віны.

Пэршы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Рэдактар **А. Прушынскі**

Выдавецтво **Т-во «Заранка»**.

СТУДЭНТКІ і СТУДЭНТЫ БЕЛАРУСЫ.

Моладзь наша, як вучаніцы і вучні, дауно ужо згу[р]таваліся у гурткі і таварыствы. Німа толькі нашай студэн[ц]кай арганізацыі.

Бацькаушчына наша хутка стане на дарогу жыцця, [на] шлях нізалежнаго дзяржаунаго бытавання. Нам трэба цяп[ер] гатавацца да тае вялікае і адпаведальнае працы, якой з[] патрэбуе ад нас наша спакутаваная айчына. З абвяшчэнн[ем] нізалежнай рэспублікі, Беларусь скінула апошняе ярмо дзя[р]жаунай залежнасьці, якое гвалтам было накінуто на яе м[а]скоускімі царамі. Чакае нас цяжкая, але салодкая, пра[ца] па адбудаванню свайго роднаго краю. Патрэбны людзі[] разумнае адданне сваіх сіл і здольнасьці дзеля адбудаван[ня] новае лепшае долі свае айчыны.

Студэнткі і студэнты. Нам трэба арганізавацца, н[ам] трэба злучыць свае сілы, каб агульнымі заходамі, узаемн[ай] дапамогай і братэрскай парадай гатаваць сябе і другіх [] тае вялікае працы, якую павінны мы будзем прынесьці [і] аддаць сваей зьнішчаной вайною Бацькаушчыне. Белару[сь] нас выгадавала, яна нас выпесьціла, яна вывела нас на ш[ы]рокі шлях сьвету і знання,—і ей мы павінны аддаць свае сілы [і] навуку.

Хто з Вас лічыць сябе сынам Беларусі, хто хоча [] лепшай долі, хто ні хоча быць наймітам у чужынцау і х[]хоча бліжэй азнаеміцца с палітычнымі і культурнымі яе з[а]даннямі,—той ніхай далучае сябе да БЕЛАРУСКАЙ СТ[У]ДЭНЦКАЙ РАЙНІЦЫ, аб якой можна даведацца у пам[е]шканню рэдакцыі газэты «Беларускі Шлях». *Серпухоу[с]кая, д. № 12.*

Друкарня Я. А. Грынблята.